# ГОРДАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ХІМІКАЎ

Тое, што звычайна будавалася гадамі, у Салігорску ўзведзена за лічаныя месяцы. Возьмем хаця б узбагачальную фабрыку. Планам прадугледжвалася яе будаўніцтва весці тры гады. Аднак будаўнікі рашылі інакш. Яны арганізавалі работу так, што гэты грандыёзны аб'ект быў закончан за 12 месяцаў.

Комплексныя брыгады Віктара Лазарэвіча, Васіля Нікіценкі і іншыя за параўнальна кароткі тэрмін—крыху больш, чым за паўгода — закончылі кладку сцен фабрыкі.

Побач з мантажнікамі, якія ўстанаўлівалі найноўшае абсталяванне, можна было бачыць і тых, каму тут прыйдзецца працаваць. Вось чаму эксплуатацыйнікі не толькі ўважліва сачылі за работай мантажнікаў, але нярэдка і самі дапамагалі ім.

За кароткі час энергетыкі калійнага камбіната запусцілі 20 падземных сілавых падстанцый з 30 і 20 падстанцый уключылі ў работу пад зямлёй. Два пад'ёмы забяспечаны насоснымі станцыямі, якія будуць даваць ваду для флатацыйных машын. Уступіла ў строй вакуумпомпавая.

Многа прыйшлося папрацаваць мантажнікам, каб уключыць у работу магутную пад'ёмную машыну шахты № 2. Больш сутак не пакідалі работы наладчыкі Журавель, Андропаў і іншыя, пакуль не ўключылі машыну ў работу.

Працаваць на ўзбагачальнай фабрыцы будзе моладзь, тыя, хто ў гэтым годзе закончыў Салігорскі горнахімічны тэхнікум. Больш 50 з іх прайшлі практыку на вопытнай узбагачальнай фабрыцы.

Можна не сумнявацца, што будаўнікі перадалі эстафету ў надзейныя рукі эксплуатацыйнікаў.

Гордасць беларускіх хімікаў — калійны камбінат уступіў у строй дзейнічаючых, служыць камунізму.

**А. БЛАХІН,**
**рэдактар шматтыражнай газеты «За коммунистический труд».**